**Э.А. Мурзіч**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
e-mail: fil.murzichEA@bsu.by

УДК 821.161.3

# КАШТОЎНАСНЫЯ АРЫЕНЦІРЫ ГАЛОЎНАГА ГЕРОЯ Ў АПАВЯДАННІ М. ЗАРЭЦКАГА «РАКАВЫЯ ЖАРОНЦЫ»

*Ключавыя словы: каштоўнасныя арыенціры, матывацыя, самарэфлексія, «ненадзейны апавядальнік», драматычная інтрыга.*

*У артыкуле разглядаецца апавяданне М. Зарэцкага «Ракавыя жаронцы» (1928), а менавіта каштоўнасныя арыенціры цэнтральнага персанажа. Аналізуецца аповед ад 1-ай асобы, з дапамогай якога раскрываюцца сапраўдныя матывы ўчынкаў героя, а таксама яго эмоцыі, што вядуць да парадаксальных учынкаў.*

Каштоўнасныя арыенціры – гэта «важнейшыя элементы ўнутранай структуры асобы, якія замацаваны жыццёвым вопытам індывіда, усёй сукупнасцю яго перажыванняў» [1, с. 33]. Іншымі словамі кожны чалавек сам выбірае, на што яму арыентавацца. Гэта могуць быць як станоўчыя ідэалы, так і адмоўныя, але свядома вылучаныя ў якасці прыкладу.

Міхась Зарэцкі (1901–1937) – майстар перадачы псіхалагічнага стану сваіх герояў. І калі мы кажам пра сумленных, высокамаральных персанажаў, то гэта не здзіўляе, бо суадносіцца з пазіцыяй самога пісьменніка, выпускніка духоўнай семінарыі. Аднак ёсць у Міхася Зарэцкага творы, галоўныя героі якіх – злодзеі, эгаісты. Сюды адносяцца, напрыклад, дзеючыя асобы аповесці «Голы звер» і апавядання «Ракавыя жаронцы».

У цэнтры апавядання «Ракавыя жаронцы» (1928), як ужо было адзначана, – злодзей і забойца, менавіта таму твор цікава разгледзець у разрэзе каштоўнасных арыенціраў галоўнага героя. Ці паказаны персанаж цалкам адмоўным, з чаго складаецца яго маральны кодэкс?

Аповед у творы вядзецца ад 1-ай асобы, што дазваляе нам не толькі паглыбіцца ў свядомасць персанажа, паспрабаваць зразумець яго матывы, але і ўбачыць яго самарэфлексію. Так, апавяданне пачынаецца з успамінаў пра дзяцінства галоўнага героя, пра яго бабулю і пра вынесеныя ў назву ракавыя жаронцы.

У дзяцінстве герой – самы звычайны хлопчык. Мы можам заўважыць у ім яркія праявы эмпатыі. «*Як я быў маладым дзіцянём, мне часта траплялася, гуляючы, запарашыць сабе вока. Тады я са слязьмі на вачах і з захаванай радасцю ў сэрцы бег да свае слаўнай бабулькі*» [2, с. 401]. Мы бачым любоў персанажа да ўласнай бабулі. Запарушанае

вока для яго было не столькі болем, колькі магчымасцю знаходзіцца побач з родным чалавекам.

Менавіта ў дадзеным моманце ярка праяўляе сябе такі элемент белетрыстыкі, як мастацкая дэталь, якая працуе для стварэння інтрыгі (у гэтым творы драматычнай або нават трагічнай). «*Ракаў заўсёды варыла нам наша бабулька. Яна вучыла нас, як трэба іх есці, і строга паказвала, каб шукалі мы ў кожнага пад вачмі белых маленькіх кружэлачак. Мы шукалі дужа старанна (на сто ракаў трапляліся яны, можа, ў двух або ў трох) і, калі знаходзілі, з радасцю аддавалі іх нашай бабульцы. Яны падобны былі на маленькія жорны, і звалі мы іх – "ракавыя жаронцы"*» [2, с. 401]. Гэтыя жаронцы з дзяцінства былі для героя ўвасабленнем выратавання, прычым як фізічнага (з іх дапамогай з-пад вока выходзіла парушынка ці пясчынка), так і маральнага (гэтымі кружэлачкамі карысталася любімая бабуля, чые рукі ласкава дакраналіся да героя, дорачы яму пяшчоту).

Мы яшчэ не ведаем пра сучасны род дзейнасць галоўнага героя, не асуджаем яго, а проста назіраем за шчаслівымі ўспамінамі, у якіх на той момант мелі месца любоў і клопат пра іншых. Менавіта аповед ад імя персанажа дазваляе пранікнуцца ім, пазбавіцца перадузятасці. Ужо потым узнікае дысананс паміж лірычнымі ўспамінамі, настальгіяй, відавочнай любоўю да бабулі і крадзяжом ды забойствам.

Успаміны рэзка абрываюцца. «*Гэта было дужа-дужа даўно...*» [2, с. 401] Герой быццам хоча забыцца пра ўласную эмпатыю, якая не патрэбная яму ў яго сённяшнім жыцці. Дзяцінства нібы было ў іншым жыцці, у паралельнай рэальнасці.

У некалькі радкоў герой укладае тыя перыпетыі, якія суправаджалі яго ў сталыя гады. Прычым адказнасць за ўсё ён перакладвае на жыццё, на лёс, што «запарушылі яго вочы». «*Мяне наперадзе чакала бруднае сметнішча – туды нёс ліхі азвярэлы вецер. Жыццёвы пыл запарашыў мне вочы, і слёзная муць заслала мой зрок – гэта былі слёзы роспачы, злосці і нянавісці. Я стаў, як сляпы, мае вочы страцілі сваю блакітную яснасць, і я ніяк не мог прасвятліць іх, бо ў мяне не было ракавых жаронцаў*» [2, с. 401–402]. Ён стаў чэрствым і эгаістычным, ён пакінуў у мінулым усё светлае, што было ў душы. Раптоўным зваротам да бабулі, таго светлага арыенціру, які ўсё яшчэ захоўваўся недзе на перыферыі яго сумлення, заканчваецца гэтая старонка жыцця персанажа.

Далей галоўны герой у агульных рысах вымалёўвае вобраз свайго сённяшняга існавання. Мы бачым, што, з аднаго боку, ён цалкам разумее, што робіць благія рэчы, ён злодзей, але з іншага – хваліць сябе за хітрасць і называе сваю «працу» добрай. «*...Адылі потым я жыў нядрэнна. Праца мая была зусім лёгкая і давала многа прыбытку. Я працаваў дужа спрытна, бо я быў хітры і рабіў заўсёды адзін*» [2, с. 402]. Герой не апраўдваецца, не патрабуе ад нас спачування, ён цынік і эгаіст. Упершыню

мы разумеем, што чалавек, які так доўга ўяўляўся нам станоўчым, мае зусім іншыя каштоўнасныя арыенціры.

Міхась Зарэцкі не робіць інтрыгі з нагоды канцоўкі твора, герой яе прамаўляе сам. «*Таму я сам страшэнна здзівіўся, калі раптам прыйшоў мой нешчаслівы канец. Безумоўна, тут выйшла вялікая недарэчнасць*» [2, с. 402]. Аднак як персанаж дайшоў да свайго жахлівага фіналу і чаму ён вінаваціць ужо не раз узгаданыя ракавыя жаронцы, – у гэтым якраз захоўваецца інтрыга.

Злодзей збіраецца абакрасці чарговы дамок на ўскраіне горада. Мы бачым яго "прафесіяналізм": выбар месца, вакол якога няма ні душы, часу, калі ў доме толькі дзіцё і бабулька. Нягледзячы на сутнасць сваёй справы і, здавалася б, забытыя чалавечыя пачуцці, першае, што заўважае герой, – гэта цішыня і спакой. Яго цягне да простага людскога шчасця, але занадта доўга ён займаецца сваёй антымаральнай, злачыннай справай. «*Была ў гэтым пакоі такая бязмежна глыбокая ціхасць, што мне заманулася сесці тут і адпачыць, забыўшыся на ўсе трывогі і клопаты. Але я ўспомніў, што трэба спяшацца*» [2, с. 402].

Яшчэ адна дэталь, якая ніяк не стасуецца з вобразам жорскага злодзея, – гэта тая нервовасць, якую выклікае ў героі дзіцячы плач. Ён будзіць у ім чалавека, а таму злачынца любымі сродкамі хоча яго заглушыць. Ён не думае пра наступствы і, каб супакоіць маленькае дзіця, накрывае яго падушкай. «*Тады раптам заплакаў дзіцёнак. Мяне заўсёды нервуе дзіцячы плач, але гэты крычаў асабліва дзіка і прарэзліва. Я ўскінуў на яго цяжкую падушку, і ён змоўк. Яны потым абвінавацілі мяне ў забойстве таго дзіцёнка. Дзівакі! Хіба я ведаў, што ён канечна памрэ?*» [2, с. 402–403]. Складана зразумець, наколькі сапраўды злодзей хацеў забіць дзіця. Паколькі мы глядзім на сітуацыю менавіта яго вачыма, думкі могуць аказацца як праўдай, так і самападманам і падманам чытачоў (прыём "ненадзейнага апавядальніка"). Аднак хутчэй за ўсё ў персанажы праяўляюцца сур'ёзныя псіхічныя адхіленні, рысы псіхапата. Ён здзяйсняе забойства, якое тлумачыць тым, што не ведаў, чым яно апынецца, у той час як здаровы чалавек ніколі нават не задумаецца супакоіць дзіця падобным чынам.

Без усялякіх згрызот сумлення злачынца пачынае абшукваць скрыні ў доме, аднак нічога не знаходзіць, акрамя тых самых ракавых жаронцаў. Дэталь, дадзеная нам аўтарам у пачатку твора, спрацоўвае ў канцы, даючы і нам, і персанажу шмат эмоцый. Ён адчувае злосць. Як чалавек, які давярае лёсу, бо ў яго справе па-іншаму нельга, герой наракае тут на яго, быццам ракавыя жаронцы аказваюцца ў хаце спецыяльна. Ён хоча знішчыць гэтыя ўспаміны і паварочваецца задушыць бабульку, якая, на яго думку, вінаватая ў з'яўленні жаронцаў як трыгера для псіхапата. Але не можа. «*Я ўбачыў худыя дрыжачыя рукі, якія яна працягвала мне насустрэчу. Я, пэўна, успомніў рукі мае бабулькі – яны былі таксама*

*худыя і дрыжачыя. Яна часта гладзіла імі мае раскудлычаныя сукрыстыя валасы. І вось – я спыніўся... Нешта балюча, востра так сціснула грудзі, заняло дыханне. Я ледзь набраў сілы, каб стаяць на нагах*» [2, с. 403–404]. І тут – катарсіс як у персанажа, так і ў чытача. Чалавек, які некалькі хвілін таму збіраўся абакрасці хату і забіў дзіця, раскайваецца ў сваіх учынках і плача.

Знойдзеныя ракавыя жаронцы быццам адкрываюць злодзею вочы на свае ўчынкі, прычым не толькі на канрэтны выпадак, але і на ўсе папярэднія. А таму нават пасля, у турме ён працягвае плакаць. «*Цяпер, калі часам у мяне запарашыцца вока, я кладу сабе пад павека белую маленькую кружэлачку. У мяне з вачэй тады цэлымі ручаямі льюцца слёзы, і я хаваюся ад сваіх таварышаў, бо яны чамусьці думаюць, што гэта я плачу. А я зусім не плачу: гэта слёзы цякуць ад таго, што запарошана вока*» [2, с. 404].

Такім чынам, галоўны герой знаходзіцца ў памежным стане. З аднаго боку ў яго галаве і душы захоўваюцца ўспаміны пра дзяцінства, дзе ён любіў і любілі яго. Аднак з-за складанасцей жыцця ён дэградуе, дазваляе сабе апусціцца да злачынстваў, і ён забываецца пра ўсё добрае, што ёсць у ім. Яго злачынная «справа» немагчымая без жорскага разліку і эгаізму. Праз адмаўленне пачуццяў ён даходзіць да забойства дзіцяці з-за плачу, які ўздымаў схаваную памяць і спачуванне. І толькі ракавыя жаронцы, трыгер для рэгрэсіі ў яго ўласнай псіхіцы, адкрываюць герою вочы.

**Літаратура**

1. Адухов, Н.М., Абдулаева, И.А. Ценностные ориентиры человеческой жизни и общества / Н.М. Адухов, И.А. Абдулаева // Мировая наука. – 2020. – № 11. – С. 32–35.
2. Зарэцкі, М. Збор твораў: у 4 т. / М. Зарэцкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1989. – Т. 1: Апавяданні. – 526 с.

**E.A. Murzich**
Belarusian State University
e-mail: fil.murzichEA@bsu.by

## Values of the main character in M. Zaretsky's story «Zarontsy rakov»

*Key words: values, motivation, self-reflection, «unreliable narrator», dramatic intrigue.*

*The article is devoted to M. Zaretsky's story «Zarontsy rakov» (1928) and to the values of the main character. The 1st person narrative is analyzed, which reveals the true motives of the hero's actions, as well as his emotions that lead to paradoxical actions.*